ЗОНА ПАВЫШАНАЙ АДКАЗНАСЦІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Аб'ёмы выпуску спецыялістаў, па нашых прагнозах, цалкам задаволяць патрэбы Беларускай АЭС і ўсёй ядзернай энергетыкі рэспублікі.

Больш за тое, ВНУ, якія рыхтуюць кадры для працы на атамнай станцыі, складаюць праграму падрыхтоўкі такім чынам, каб у выпадку адсутнасці вакансіі на БелАЭС спецыяліст мог працаваць не толькі ў атамнай галіне, але і ў структурах традыцыйнай энергетыкі, даследчых інстытутах, РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя Аляксандрава, на прадпрыемствах, што выпускаюць дазіметры і радыяметры, і гэтак далей.

Працаваць у ядзернай галіне было прэстыжна ва ўсе часы. Праца атамшчыкаў цэніцца ва ўсім свеце, гэта адна з самых высокааплатных прафесій. У Беларусі заробак спецыялістаў АЭС таксама будзе адрозніваца ад сярэдняга па краіне. Але вучыцца на адпаведных спецыяльнасцях даволі складана. Да таго ж і сама прафесія патрабуе вялікай самааддачы і пастаяннага самаўдасканалення.

Трэнажоры запраграмаваны на тое, каб ствараць пазаштатныя сітуацыі, з якіх персанал павінен будзе знайсці выйсце. Такім чынам змяншаецца рызыка «чалавечага фактару», які становіцца галоўнай прычынай усіх тэхнагенных катастроф.

Тым не менш цікавасць абітурыентаў да «атамных» спецыяльнасцяў расце, што пацвярджаюць вынікі апошняй прыёмнай кампаніі. Так, конкурс на спецыяльнасці, звязаныя з ядзернай энергетыкай, вырас, а сума ўступных балаў на некаторыя з іх павялічылася ў 1,5 раза ў параўнанні з папярэднімі наборамі. Па некаторых спецыяльнасцях прахадны бал быў вышэйшы за 300.

За практычным досведам — да суседзяў

Кожны з чатырох універсітэтаў мае доўгатэрміновыя дагаворы з расійскімі вышэйшымі навучальнымі ўстановамі для праходжання беларускімі студэнтамі на іх базе практыкі. Напрыклад, БДУ актыўна працуе з Нацыянальным даследчым ядзерным універсітэтам «МІФІ» (г. Масква), а БНТУ — з Ніжнегародскім універсітэтам імя М.І. Лабачэўскага.

Прарэктар па вучэбнай рабоце Белдзяржуніверсітэта Аляксей ТОЛСЦІК паведаміў, што на ядзерных спецыяльнасцях ва ўніверсітэце навучаецца каля 400 студэнтаў. Іх падрыхтоўка вядзецца на фізічным і хімічным факультэтах, а таксама ў МДЭІ імя Сахарава.

— Міжнародны дзяржаўны экалагічны інстытут быў створаны 23 гады таму пасля аварыі на ЧАЭС, таму ў нас былі і кадры, і навуковыя напрамкі, якія без прамаруджвання дазволілі ўключыцца ў падрыхтоўку спецыялістаў, што спатрэбяцца пры эксплуатацыі Беларускай АЭС, — падкрэслівае **дырэктар інстытута Сяргей МАСКЕВІЧ.** — Навучанне вядзецца па дзвюх спецыялізацыях у рамках спецыяльнасці «Ядзерная і радыяцыйная бяспека». У лютым 2014 года адбыўся першы выпуск — 15 чалавек, а ў лютым 2015-га было выпушчана яшчэ 25 спецыялістаў.

Будучым інжынерам-ядзершчыкам выкладаюць не толькі беларускія, але і замежныя спецыялісты, у тым ліку і з Японіі, дзе таксама сутыкнуліся з наступствамі радыяцыйнай катастрофы. Студэнты БДУ праходзяць практыку на дзейных АЭС і ў вучэбных цэнтрах Расіі і Украіны. Па лініі МАГАТЭ Белдзяржуніверсітэт атрымаў трэнажор ядзернага рэактара.

А вось БДУІР вядзе падрыхтоўку спецыялістаў, якія будуць абслугоўваць усю электроніку АЭС. Падрыхтоўка мае тры складнікі: гэта базавая электронная падрыхтоўка, інфармацыйныя тэхналогіі і вывучэнне спецыфікі атамнай электрастанцыі, у тым ліку ядзернай фізікі, сістэм аўтаматыкі і кантролю АЭС, дазіметрыі, абароны ад выпраменьванняў і г.д.

Выкладанне студэнтам ядзерных спецыяльнасцяў вядзецца на кафедры электронікі. Тут устаноўлена такое ж абсталяванне, як на будучай станцыі (пастаўшчыкамі трэнажораў сталі распрацоўшчыкі абсталявання для Беларускай АЭС). Пры гэтым каля 80% студэнтаў праходзяць практыку на дзейных атамных станцыях і ў вучэбных цэнтрах Расіі і Украіны. Усе выкладчыкі, якія задзейнічаны ў падрыхтоўцы студэнтаў, таксама прайшлі павышэнне кваліфікацыі ў згаданых цэнтрах.

Мікалай Маруда дадаў, што, пачынаючы з 2009/2010 года, на закупку новага абсталявання для падрыхтоўкі кадраў па ядзерных спецыяльнасцях штогод выдзяляецца каля 4 млрд рублёў.

Ніякіх скідак на слабы пол!

У пытаннях падрыхтоўкі ўласных кадраў Беларусь арыентуецца на досвед Расіі. Улічваючы яе пазіцыі як сусветнага лідара ў атамнай энергетыцы, а таксама тое, што мы будуем станцыю па расійскім праекце, вопыт партнёраў з'яўляецца неацэнным для нас, асабліва на пачатковым этапе.

У адпаведнасці з кіруючымі дакументамі МАГАТЭ персанал ключавых пасад АЭС павінен быць укамплектаваны за два гады да ўводу энергаблока ў эксплуатацыю.

На закупку новага абсталявання для падрыхтоўкі кадраў па ядзерных спецыяльнасцях штогод выдзяляецца каля 4 млрд рублёў.

— На сённяшні дзень на станцыі працуюць 437 работнікаў, з іх 40 замежных спецыялістаў, 250 спецыялістаў з беларускай энергасістэмы і 67 маладых спецыялістаў, — праінфармаваў **намеснік начальніка вучэбна-трэніровачнага цэнтра Беларускай АЭС Аляксандр ЕРЫН.** — Усе супрацоўнікі АЭС, незалежна ад вопыту работы, будуць праходзіць пастаяннае навучанне і павышаць сваю кваліфікацыю. Для людзей шэрагу пасад кожная сёмая змена будзе праходзіць на вучэбных трэнажорах.

У вучэбна-трэніровачным цэнтры АЭС устаноўлены поўнамаштабны трэнажор — дакладная копія пульта кіравання атамнай станцыяй. На ім будзе адпрацоўваць свае навыкі персанал блокавага пульта кіравання АЭС, які нясе адказнасць за ядзерную і радыяцыйную бяспеку, забяспечвае надзейную і безаварыйную эксплуатацыю АЭС. Вучэбна-трэніровачны цэнтр літаральна начынены навучальнымі трэнажорамі і неабходным вучэбным абсталяваннем. Трэнажоры запраграмаваны на тое, каб ствараць пазаштатныя сітуацыі, з якіх персанал павінен будзе знайсці выйсце. Такім чынам змяншаецца рызыка «чалавечага фактару», які становіцца галоўнай прычынай усіх тэхнагенных катастроф.

Як правіла, да кіравання абсталяваннем і сістэмамі блока дапускаюцца спецыялісты з пэўным узроўнем падрыхтоўкі і вопытам працы на АЭС. Беларуская станцыя не выключэнне, і таму першапачаткова тут будуць працаваць пераважна запрошаныя спецыялісты з досведам работы на АЭС Расіі і Украіны. Але побач з імі будуць знаходзіцца беларусы, якія змогуць набыць адпаведны вопыт і выкарыстоўваць яго пры пуску другога энергаблока. Паступова замежныя спецыялісты будуць замяняцца беларускімі...

Цікава, што дзяўчаты таксама змогуць працаваць на АЭС, але разлічваць на адказныя пасады ім не даводзіцца. На цеплавых электрастанцыях прадстаўніцы слабага полу працуюць начальнікамі змены і нават дабіваюцца звання «найлепшая ў прафесіі», дык чаму на АЭС сітуацыя іншая? Няўжо спрацоўваюць гендарныя стэрэатыпы?

«Калі хтосьці будзе рэгулярна прапускаць работу ці запланаваныя на трэнажорах заняткі з прычыны, скажам, хваробы дзіцяці, не кажучы ўжо пра дэкрэтны адпачынак, то аднавіць прафесійны ўзровень ім будзе вельмі праблематычна, — тлумачаць спецыялісты. — Адказны ўчастак працы патрабуе самай высокай кваліфікацыі. І ніякіх скідак на слабы пол тут быць не можа...»

Надзея НІКАЛАЕВА.
nikalaeva@zviazda.by

Спецыяльнасці, на якіх рыхтуюць кадры для Беларускай АЭС:

— ядзерныя фізіка і тэхналогіі;
— хімія высокіх энергій;
— будаўніцтва цеплавых і атамных электрастанцый;
— паратурбінныя ўстаноўкі атамных электрычных станцый;
— электронныя і інфармацыйна-кіруючыя сістэмы фізічных устаноўак;
— ядзерная і радыяцыйная бяспека.
Тэрміны навучання вагаюцца ад 5 да 5,5 года.

■ Добрая навіна

СЭЛФІ З ПТУШЫНАГА РАКУРСУ

У гамяльчан з'явілася свая вежа для агляду наваколля. Трэба толькі заплаціць Br15 тысяч, пераадолець 204 прыступкі — і ты на самай вяршыні: 40 метраў над зямлёй і мора прыгажосці.



Калісьці, у 1840-х, гэтае збудаванне было комінам цукровага завода, які належаў князям Паскевічам. Гавораць, даволі хутка вытворчасць перамясцілі ў Добруш, а пабудовы былі прыстасаваны пад аб'екты паркавага прызначэння. Так, ужо пасля рэканструкцыі ў канцы XIX стагоддзя комін стаў выкарыстоўвацца як вежа для агляду.

З таго часу яна шмат чаго перажыла. У гады Вялікай Айчыннай вежа пацярпела пры абстрэлах горада над Сожам. На сцяне з боку ракі дагэтуль

засталіся сляды ад асколкаў снарадаў і куль, у цэгле затрымаўся метал. Невыпадкова і сёлетняе адкрыццё адбылося менавіта ў пахмурны лістападаўскі дзень — 72 гады таму савецкія войскі ўвайшлі ў толькі што пакінуты немцамі правабярэжны Гомель. Кажуць, былі прапановы замазаць адтуліны, каб усё было як новае. Але ж гісторыя ажывае ў гэтых цаглінах, якія памятаюць жудасныя часіны ваенных выпрабаванняў.

Пасля вайны будынак выкарыстоўваўся па сваім прызначэнні. У савецкі час за 3 капейкі на вежу можна было забрацца па неасветленай лесвіцы. У пачатку нашага стагоддзя цікавы для турыстаў аб'ект прызналі аварыйным і закрылі на рэстаўрацыю.

Амаль дзесяцігоддзе мы не бачылі Гомель з вышыні птушынага палёту, і вось зноў у гамяльчан з'явілася такая магчымасць. Большасць з маладых людзей у першы працоўны дзень вежы прыйшлі ўзброеныя фотаапаратамі і палкамі для сэлфі. Каб любавацца далягляда мі і рабіць здымкі на вышыні было бяспечна, на верхняй пляцоўцы зроблена спецыяльная агароджа. Сучаснае асвятленне ўнутры вежы, новая вітая цалкам металічная лесвіца, зручныя парэнчы — усё, каб госці горада адчувалі сябе ўтульна.

З вежы ўвесь Гомель сапраўды як на далоні, відаць нават прыгарадныя вёскі. Між тым кіраўніцтва гомельскага палацава-паркавага ансабля абяцае, што налета пачнуцца рэстаўрацыйныя работы і ў былым наземным вытворчым корпусе цукровага завода Паскевічаў, дзе цяпер размешчана аранжарэя з экзатычнымі раслінамі.

Ірына АСТАШКЕВІЧ,
фота аўтара.
iost@zviazda.by

ЗНАК НА МЯЖЫ

На стыку Беларусі, Польшчы, Украіны, каля вёскі Тамашоўка Брэсцкага раёна, устаноўлены знак «Буг» і памежныя слупы сучаснага ўзору.

Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Работы па дэмаркацыі дзяржаўнай мяжы з Украінай вядуцца поўным ходам. У гэтым пераканаліся ўдзельнікі мерапрыемства, якое прайшло на ўчастку мяжы ў Брэсцкім раёне. Як вядома, 30 ліпеня 2014 года было падпісана пагадненне паміж урадамі Беларусі і Украіны, якое зацвердзіла палажэнне аб дэмаркацыі дзяржаўнай мяжы паміж краінамі. Восенню мінулага года пачаліся работы. Згодна з планам, на увесь комплекс мерапрыемстваў спатрэбіцца 7-8 гадоў і 160-170 мільярдаў рублёў.

Зараз дэмаркацыя праводзіцца ў чатырох раёнах Брэсцкай вобласці — Брэсцкім, Маларыцкім, Іванаўскім і Кобрынскім. І да канца гэтага года беларускім бокам будуць завершаны будаўніча-мантажныя работы па абазначэнні дзяржаўнай мяжы на ўчастку працягласцю каля 112,6 кіламетра, дзе плануецца ўстанавіць больш за 400 памежных знакаў.

З ходам работ азнаёмілася дэлегацыя беларуска-ўкраінскай Сумеснай дэмаркацыйнай камісіі на чале з начальнікам упраўлення дэлімітацыі і дэмаркацыі дзяржаўнай мяжы Дзяржаўнага памежнага камітэта Беларусі Аляксандрам АРХІПАВЫМ. Удзельнікі сустрэчы прысутнічалі пры ўстаноўцы памежнага слупа Рэспублікі Беларусь на сотым па ліку памежным знаку.

А вось дэмаркацыю пункта стыку трох дзяржаў абмяркоўвалі ў свой час у трохбаковым парадку. Адпаведны дакумент быў падпісаны 14 сакавіка 2013 года кіраўнікамі памежных ведамстваў Беларусі, Польшчы, Украіны ў Луцку. На мяжы неўзабаве з'явіцца ўнікальны аб'ект, які можна лічыць славутасцю. Ён складаецца з трох ідэнтычных элементаў. Беларусь устанавіла свой знак першай. Слуп з чырвонага граніту вышынёй у два з паловай метры на адным са сваіх бакоў мае адлюстраванне герба Рэспублікі Беларусь і надпіс «БУГ». Гэтая рака аб'ядноўвае тры дзяржавы. І зусім хутка паблізу з'явяцца знакі з украінскім і польскім гербамі.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Сумесны праект „Звязды" і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях

ЖЫВІЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ!

АДМОВІЦЦА АД ЦЫГАРЭТ

Фінал акцыі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях «Не марнуй сваё жыццё!» ператварыўся ў сапраўднае шоу

Наведнікі мінскага гандлёвага цэнтра «Сталіца», якія ў суботу прыйшлі туды па пакупкі, трапілі на маштабную антытытунёвую акцыю, якую праводзілі сталічныя ратаўнікі. Яны прапаноўвалі ўдзел у мноستве цікавых інтэрактыўных конкурсаў, сфатаграфавацца з роставымі лялькамі, прымераць баёўку і нават пакінуць свае пажаданні курцам на спецыяльнай сцяне.

— Дзень добры, бяспройгрышная латарэя! — з такімі словамі супрацоўнікі Ленінскага РАНС Мінска віталі людзей, якія падыходзілі да ярка афарбаванага стэнда ратаўнікоў побач з уваходам у гандлёвы цэнтр. — Курыце? Тады вам да нас. Дастаньце, калі ласка, пачак з цыгарэтамі, скамячыце яго і кіньце ў каробку. А цяпер цягніце нумарок. Прайграць немагчыма, вам абавязкова дастанецца якінебудзь маленькі прыз — эклер, печыва, стыкер, бірулька або наш каляндарык... І трымайце нашу антытытунёвую ўлётку.

У Беларусі дзевяць з дзесяці пажараў адбываецца з-за непатушаных цыгарэт. Часцей за ўсё падзеі разгортваюцца па класічным сцэнары: выпіў, закурыў, заснуў... А што будзе далей, залежыць ужо ад таго, як хутка выклічуць ратаўнікоў. Сёлета курэнне ў нецвярозым стане ўжо забрала 274 чалавечыя жыцці. Яшчэ дзве з паловай сотні курцоў удалося выратаваць. Прычым загінуць на пажары рызыкуе не толькі курэц, але і яго сям'я. Сучасныя сінтэтычныя матэрыялы, якімі літаральна нашпігавана кожная кватэра, пры гарэнні вылучаюць атрутныя таксіны. Ува сне адчуць непрыемны пах чалавек не можа, таму рызыкуе не прачнуцца ўвогуле.

— Наша прафілактычная рэспубліканская акцыя «Не марнуй сваё жыццё!» праходзіла з 13 лістапада, — расказвае **начальнік цэнтра прапаганды і сацыякультурнай дзейнасці Мінскага гарадскога ўпраўлення МНС Павел ФІЛІМОНАЎ.** — Сёння ж актывісты Беларускай маладзёжнай грамадскай арганізацыі ратаўнікоў-пажарных дзяжураць на ўсіх трох узроўнях гандлёвага цэнтра. Вось зараз побач з намі дзеці малююць карцінкі, каб загітаваць сваіх бацькоў да таго, каб яны прытрымліваліся здаровага ладу жыцця. Тут мы выкарыстоўваем адзін псіхалагічны эфект — вядома, што дзіцячыя малюнкі на сур'ёзныя тэмы куды больш кранальныя...

Частка супрацоўнікаў МНС перапрануліся на час акцыі ў белыя халаты і прапаноўвалі наведнікам вымераць аб'ём лёгкіх — органа, па якім цыгарэтны дым б'е куды больш, чым па іншых. А рабілася гэта цікавым спосабам — надзьмуваннем паветранага шара. Зразумела, што курыльшчык са стажам надзьмуць балонік да вялікіх размераў наўрад ці зможа. Вось і яшчэ адна прычына, каб развітацца з цыгарэтамі назаўжды.

Фота Надзеі БУЖАН.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.
schklennik@zviazda.by

■ Ну і ну!

КАМЕРУНСКІ ПАПУГАЙ-АШУКАНЕЦ

Насамрэч экзатычная птушка мае выключна віртуальнае дачыненне да гісторыі, у якую трапіла жыхарка Веткаўшчыны. Пры гэтым рэальныя $7 тысяч са збяражэнняў сям'і «адляцелі» ў цёплую краіну.

Кажуць, чым недарэчнейшая хлусня, тым ахвотней у яе вераць. Вось і супрацоўніца аднаго з сельскіх ФАПаў на сайце DOSKA.by знайшла аб'яву, у якой нехта прапаноўваў аддаць у добрыя рукі папугаяў жако. Жанчына тут жа напісала ліст на адрас электроннай пошты прадаўца Ганны Jezreel.

Уладальніца рэдкіх птушак на працягу 11 дзён падрабязна распытвала суразмоўцу па перапісцы пра клімат, пра ўмовы ўтрымання, пра любоў будучай гаспадыні да птушак... Урэшце падцвердзіла сваю гатоўнасць аддаць птушак абсалютна бясплатна. І калі беларуска гатовая была прыняць папугаяў, высветлілася, што трэба заплаціць за іх транспартаванне ў Беларусь з Камеруна. Менавіта ў гэтай краіне знаходзілася ўладальніца. Дамовіліся, што беларуска перавядзе $500 за трох папугаеў, якіх ёй вышлюць самалётам. Дарэчы, грошы жанчына ўзяла з агульнага рахунку ва ўмовах поўнай сакрэтнасці ад мужа. Дома яна паведаміла код плацяжу для здымання грошай. На наступны дзень запатрабавалася яшчэ $960 — за арэнду клетак для авіяперавозкі. Потым — за страхоўку ($3570). Потым — за прышчэпкі жывому грузу ($1650). Аматарка экзотыкі аплаціла і гэту працэдуру. Невядомая асоба з Афрыкі ўпэўнена сцвярджала, што ўсе пералічаныя грошы хутка будуць вернутыя і папрасіла яшчэ $1400 — для афармлення праязных дакументаў.

Толькі ў гэты момант да вясковай жанчыны дайшло, што з яе банальна цягнуць грошы, і толькі тады яна звярнулася ў міліцыю. Усяго ж за некалькі дзён беларуска перавяла ў Камерун $6690 і заплаціла камісію банку ў памеры $337.

Як расказалі ў прэс-службе Гомельскага абласнога УУС, праваахоўнікі высветлілі, што камп'ютары, з якіх вялася перапіска з жыхаркай нашай краіны, знаходзяцца ў Камеруне і ЗША. На мінулым тыдні Веткаўскім РАУС па факце махлярства ў буйным памеры заведзена крымінальная справа. Пытанне, ці вернуцца сродкі за віртуальных папугаяў, застаецца адкрытым. Цяпер зроблены неабходныя запыты, трэба чакаць афіцыйных адказаў.

Між тым у сусветным павуцінні шмат гісторый пра аналагічныя гісторыі з удзелам «бясплатных» птушак у якасці прынады. Пяць гадоў таму нават узнік тэрмін «камерунскае ашуканства». Так назвалі яго жыхары Амерыкі. Потым ідэя вымагання грошай «на птушку» захапіла Еўропу, а цяпер дайшла і да постсавецкай прасторы. Схем у махляроў шмат. Іх задача — выцягнуць з даверлівых пакупнікоў як мага больш грошай.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
iost@zviazda.by

■ Да ведама

ТАРЫФЫ НЕ БУДУЦЬ «ЦІСНУЦЬ» НА ПАСАЖЫРАЎ?

Беларуская чыгунка ініцыюе зніжэнне тарыфаў на праезд у міжнародных цягніках у зносінах з расійскімі чыгункамі на 2016 год. Пра гэта паведаміў першы намеснік начальніка пасажырскай службы магістралі Андрэй КАШКО.

У Беларусі кошт праязнога дакумента ў цягніках міжнародных зносін прывязаны да тарыфнай валюты, якой з'яўляецца швейцарскі франк. У сувязі з гэтым, улікам пэўных эканамічных працэсаў, якія адбываюцца як у Беларусі, так і Расіі, Беларуская чыгунка робіць сумесныя крокі з расійскімі калегамі па зніжэнні тарыфнай нагрузкі на пасажыраў. «Чарговыя нашы прапановы накіраваны ў Расію для разгляду. Будзем чакаць адказу расійскіх калег па гэтым пытанні». Пры гэтым першы намеснік начальніка пасажырскай службы Беларускай чыгункі адзначыў, што ў краіне захаваны ў базавых каэфіцыентах тарыфы 2015 года на наступны перавозачны перыяд. «Мы пастараліся ўтрымаць сённяшнія сезонныя тарыфы — яны адпавядаюць тарыфам мінулага года, якія былі ў лістападзе 2014-га», — заўважыў Андрэй Кашко. «Мы дамовіліся, што будзем, па магчымасці, стрымліваць тарыфы. Таму звярнуліся да расійскіх партнёраў з прапановай знізіць тарыфную нагрузку на 2016 год». Разам з тым на фарміраванне тарыфаў у цягніках міжнародных зносін аказваюць уплыў інфляцыйныя працэсы. «У лютым 2015 года мы прынялі сумесна з расійскімі партнёрамі беспрэцэдэнтнае рашэнне па зніжэнні тарыфаў адразу на 30 працэнтаў. Але пры гэтым у сакавіку адбыўся рост тарыфнай валюты, і ўсе нашы зніжэнні выраўнаваліся».

АДМЕНЕНЫ ЗБОР ЗА ВЫПРАЎЛЕННЕ ПАМЫЛКІ

Авіякампанія «Белавія» адмяніла новую платную паслугу па пераафармленні памылкова запоўненых білетаў, уведзеную з пачатку месяца. Адпаведна скасаваны і збор у памеры 30 еўра за выпраўленне памылкі ў імені або прозвішчы пасажыраў.

Нагадаем, такія сітуацыі маглі ўзнікнуць, калі апошнія афармлялі авіябілеты лацінскімі літарамі, перакладаючы, напрыклад, прозвішча з рускай мовы. А пры рэгістрацыі прад'яўлялі пашпарт, у якім прозвішча напісана ў беларускім варыянце. Уласна для самой авіякампаніі гэта не было вялікай праблемай, бо яе прадстаўнікам зразумела, што гаворка ідзе пра аднаго і таго ж пасажыра. Але пры вылеце з-за мяжы ў яго маглі ўзнікнуць праблемы, рэгістрацыя на рэйс магла заняць больш часу.

Як патлумачыла журналісту «Звязды» начальнік аддзела рэкламы і камунікацый авіякампаніі Вольга Герасенка, «Белавія» адмяніла збор за выпраўленне памылкі ў імені або прозвішчы пасажыраў, «бо іх лаяльнае стаўленне да кампаніі і станоўчыя водгукі нашмат больш важныя».

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

ПАДАГРАВАЎ ЭЛЕКТРАЧАЙНІК... НА ЭЛЕКТРАПЛІТЦЫ

У канцы рабочага дня ў будынку па сталічным праспекце Пераможцаў спрацавала сігналізацыя сістэмы перадачы паведамлення пра надзвычайнае здарэнне «Маланка».

Падчас разведкі ратавальнікі ўстанавілі, што на другім паверсе двухпавярховага будынка адбылося загаранне электрачайніка, які пакінулі на электраплітцы. Вінаватай асобай аказаўся 79-гадовы слесар. Пажар аператыўна ліквідавалі, у выніку здарэння ніхто не пацярпеў.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*